# Пасяджэнне “Роднай зямлі шматгалоссе…”

У сваім краю, як у раю.

Родны, любы куточак, блізкі і дарагі сэрцу. У кожнага ён свой, але аб’ядноўвае ўсіх нас агульнай назвай – Радзіма. Мы любім месца, дзе нарадзіліся і жывём, любім родную прыроду, свой народ, сваю родную мову і песні сваіх вяскоўцаў, іх танцы, побыт, абрады, іх талент...

На базе дзяржаўнай УК “Ашмянская раённая бібліатэка” прайшло сумеснае пасяджэнне ўдзельнікаў клуба “Бяседа”, які працуе пры дзённым аддзяленні для грамадзян сталага ўзросту ГУ “ТЦСАН Ашмянскага раёна”, і аматарскага аб’яднання “Мудрасць” пад назвай “Роднай зямлі шматгалоссе…”.

Прыемна было адкрываць для сябе таленавітасць нашых землякоў, якія праз карціны, фотаздымкі, меладычныя вершы паказваюць прыгажосць роднага куточка. З асаблівай асалодай у сэрцы слухалі прысутныя пявучую беларускую мову, і кожны адчуваў у душы вялікі гонар за сваю малую радзіму.

Тамара Уладзіміраўна Філіповіч, якая доўгі час працавала дырэктарам ААТ “Ашмянскі мясакамбінат”, паказала свае фотаздымкі аб ашмянскім краі, якія ляглі ў аснову яе кніг “Время и люди” і “Падарожжа па Ашмяншчыне”.

Галіна Аляксандраўна Даўгашэй, былы выкладчык матэматыкі ў Ашмянскім сельскагаспадарчым тэхнікуме, прачытала свае лірычныя вершы пра маці. Яе выступленне прадоўжыла Марыя Яўстаўф’еўна Пазняк.

Гучалі вершы пра квітнеючыя сады, залатыя ад збожжа нівы, бялюткі бярозавы стан, пра шчасце нарадзіцца пад гэтым небам, сінім, як родныя васількі.






